# Станаўленне інстытута ў 30-я гады

*Мароз М.В.*
Навуковы кіраўнік – канд. гіст. навук, дацэнт *Хромчанка Д.Н.*

Ужо ў 1933 г. у БПІ навучалася звыш 1200 студэнтаў, з іх 62 % з'яўляліся працоўнымі або дзецьмі працоўных. У 1934 г. палітэхнічны інстытут прыняў удзел у другім усесаюзным спаборніцтве ВНУ, ВТНУ, тэхнікумаў. Студэнты Беларускага дзяржаўнага палітэхнічнага інстытута прымалі ўдзел і ў заключэнні дагавора аб усебеларускім сацыялістычным спаборніцтве на лепшае правядзенне рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі (другога выпуску). У гэтым жа годзе адбыўся першы выпуск інжынераў, які склаў 120 высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў. Рашэннем урада былі створаны спецыяльныя курсы па перакваліфікацыі тэхнікаў і інжынераў, якія ў выніку былі пераўтвораны ў факультэт беларускага палітэхнічнага інстытута. Гэтыя курсы былі ўкамплектаваны з асоб, скончыўшых сярэднія тэхнічныя навучальныя ўстановы і пераважна маючых 3-5 гадовы вытворчы стаж. ЦК ВКП(б) і ўрад паставілі перад савецкім студэнцтвам задачу стаць лепшымі інжынерамі ў свеце. Так узнікла сацспаборніцтва. Студэнтам амаль па ўсіх соцумовах былі дадзены абавязацельствы вывучаць творы Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, такія, як “Паходжанне сям’і, прыватнай уласнасці і дзяржавы”, “Дзяржава і рэвалюцыя” і інш. На прыканцы 30-х гг. значна змяніліся абставіны з падрыхтоўкай спартсменаў. Стварыліся мужчынскія і жаночыя валейбольныя каманды, і, як адзначалі прадстаўнікі каманд Кіева і Архангельска, каманды мелі добрую падрыхтоўку. У перыядычных выданнях адзначалі, што акрамя падрыхтоўкі савецкіх інжынераў у палітэхнічным інстытуце вялася падрыхтоўка і ваенных кадраў. Асноўнай мэтай інстытута была падрыхтоўка камандзіраў узводаў запаса. Ваенная падрыхтоўка ў інстытуце вялася на аснове шырокага разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва (групавога і індывідуальнага). Аб’ектам спаборніцтва з’яуляліся асноўныя віды як спецыяльнай, так і тактычнай падрыхтоўкі, прычым ставілася задача вывесці інстытут на ВВП у перадавыя Вузы СССР.